**А. Галонская**

# ФАРМІРАВАННЕ ТАЛЕНТУ НАРОДНАГА ПІСЬМЕННІКА ЯКУБА КОЛАСА

Выбар тэмы “Фарміраванне таленту народнага пісьменніка Якуба Коласа” абумоўлены жаданнем даследаваць уплыў выхавання ў маленстве, развіццё дзіцяці, яго жыццёвы шлях і выбар прафесіі.

У працы мы даследуем, якая сістэма выхавання склалася ў сялянскай сям’і Міцкевічаў, што абудзіла Кастуся, рушыла ў рост і найбольш паспрыяла развіццю яго таленту.

Каб з маленькага чулага Кастуся, надзеленага прыродным незвычайным дарам, вырас вялікі пясняр, патрэбна асяроддзе, умовы, у якіх панавала б любоў, лад і згода. Фарміраванне чалавека пачынаецца ў раннім узросце.

Непасрэднае ўспрыманне, блізкае адчувальнасцю да фатаграфічнай плёнкі, здольнай утрымліваць адбіткі падзей, родных з’яў і вобразаў, усяго, на што б ні пасвяціў сонечны прамень з уласнага дапытлівага вока вылучала паэта. Толькі адна ўражлівасць не магла “сфарміраваць талент”. Менавіта, народныя песні прыйшлі ў творчасць Я. Коласа, замацаваўшы фальклорныя вобразы, архетыпы, якія былі добра зразумелы і складалі генетычны код народа. Яго падтрымалі ў першую чаргу блізкія.

У патрыярхальнай сям’і роля маці была ў выхаванні і перадачы народнай культуры. Напрыклад, святкаванне каляд, якое дзеці заўсёды чакалі. На фарміраванне таленту Якуба Коласа вельмі моцна паўплывала асоба маці. “І другое, што ўражвала больш за ўсё: матчын голас. Нават калі яна сварылася на нас і пачынала ўшчуваць, голас не траціў мяккасці і дабраты. Я вельмі любіў, як яна спявала” (Я. Колас).

Асоба дзядзькі стала яшчэ адным штуршком для станаўлення творчай індывідуальнасці паэта. Дзядзька Антось змог прывіць Кастусю любоў да чалавека, кнігі, працы, прыроды. Роля дзядзькі – гэта выхавацель. Кнігі таксама імелі моцны ўплыў на выхаванне дзяцей.

Жыццёвую перспектыву сваім хлопцам бацька Міхал бачыў у адукацыі, менавіта таму, што Міхаіл Казіміравіч Міцкевіч быў леснікам і быў ён невялікай адукацыі: умеў распісацца і чытаць.

У раздзеле “Дарэктар” гаворыцца аб выхаванні дзяцей у дарэвалюцыйны час. Школ тады было вельмі мала, многія дзеці не вучыліся і заставаліся непісьменнымі. Першую навуку лесніковыя дзеці прайшлі дома. Каб навучыць дзяцей грамаце, Міхал наймаў “дарэктара”, звычайнага сялянскага хлопца, які скончыў прыходскае пачатковае вучылішча. Міхал трымаў дзяцей у строгасці не толькі словам, але і больш суровым спосабам. Асабліва строга ён ставіўся да навучання.

Выхаванне ў патрыярхальнай сялянскай сям'і моцна паўплывала на развіццё Я. Коласа і яго лёс. Фарміраваліся і развіваліся яго таленты, дадзеныя ад прыроды. Народныя традыцыі, абрады, звычаі, якія ўшаноўлівася ў сям'і, склалі талент народнага пісьменніка. З маленства пясняр засвоіў генетычны код свайго народа, таму фальклор з'явіўся невычорпнай крыніцай вобразаў для творчасці Я. Коласа.